**А.В.Бадакоў**, *прафесар*

# АБ НЕКАТОРЫХ АСПЕКТАХ ФАРМІРАВАННЯ ТВОРЧАГА МЫСЛЕННЯ СТУДЭНТАЎ НА СЕМІНАРСКІХ ЗАНЯТКАХ ПА ФІЛАСОФСКІХ НАВУКАХ

Праблема чаму і як вучыць заўсёды была актуальнай. Аднак асаблівае значэнне яна набывае ў наш час. Можна сказаць, што гэтая праблема стала лёсавызначальнай для сучаснай цывілізацыі. Асаблівае значэнне яна мае ў сферы гуманітарнай адукацыі, якая развіваецца вельмі дынамічна. Асноўнай у вырашэнні гэтай праблемы з'яўляецца падрыхтоўка спецыялістаў, якія творча мысляць і дзейнічаюць. Для ВНУ гуманітарнага профілю яна з'яўляецца галоўным сістэмаўтваральным элементам вучэбна-выхаваўчага працэсу, і гэта аб'ектыўна абумоўлена. Менавіта ў сферы культуры назіраецца нарастанне нетрадыцыйна новых праблем, якія патрабуюць новых метадаў іх вырашэння. Мы заўважаем працэс скарачэння тэрмінаў жыцця ведаў, іх "старэння", неабходнасці іх аднаўлення. Ідзе працэс, які паскарае змену "пакаленняў" прафесій з адначасовым узрастаннем у прафесійнай дзейнасці творчых інтэлектуальных здольнасцей і навыкаў, а значыць, і творчасці. Праблема ўскладняецца тым, што ў станаўленні і развіцці вышэйшых узроўняў культуры і мастацтва непазбежна будуць узмацняцца дэмакратычныя і плюралістычныя тэндэнцыі. Натуральна, што такое ўзмацненне абавязвае гуманітарную вышэйшую навучальную установу вучыць усяму гэтаму студэнтаў. Патрабуецца такая арганізацыя вучэбна-выхаваўчага працэсу, якая б будавалася на цэласнай сістэме асноўных парадыгмаў сучаснай адукацыі, на асобасным характары арганізацыі адукацыі; на антрапалагічнай і культуралагічнай яе арыентацыі; развіваючай адукацыі і саманавучанні; высокай праксіялагічнай функцыянальнасці

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

гуманітарных ведаў, якія ўключаюць спецыяліста ў інфармацыйна-семантычнае поле сучаснай культуры; на эфектыўнай выхаваўчай інфармацыйнай адукацыі, якая фарміруе высокія грамадзянскія якасці спецыяліста, яго патрыятызм і гуманізм, гатоўнасць служыць народу.

З улікам вышэйвыкладзенага ясна, што вучэбна-выхаваўчы працэс, які ажыццяўляецца кафедрамі сацыяльна-гуманітарнага цыкла, павінен быць арыентаваны на тры асноўныя складаючыя тэхналогію навучання: а) самастойнае атрыманне студэнтам новай інфармацыі пад кіраўніцтвам выкладчыка з дапамогай лекцый, вучэбна-метадычных дапаможнікаў і матэрыялаў; б) працэс самаадукацыі як працэс фарміравання логікі мыслення будучага спецыяліста, здольнага ўспрымаць нестандартныя сітуацыі, якія ўзнікаюць у вучобе і дзейнасці; в) фарміраванне здольнасці адчуваць і разумець праблемныя сітуацыі і знаходзіць для іх аптымальныя рашэнні.

Выхаванне творчых якасцей будучага спецыяліста ў ВНУ прад'яўляе да вучэбнага працэсу, такім чынам, рад аб'ектыўных патрабаванняў. Каб вырашаць вышэйвыкладзеныя праблемы, вучэбны працэс павінен будавацца на наступных прадпасылках: а) узаемадапаўняльнасці і аптымальным спалучэнні лекцый і практычных заняткаў, адукацыі і самаадукацыі; б) адэкватнасці формаў правядзення семінарскіх заняткаў з выкарыстаннем вучэбнай і метадычнай літаратуры, якая заключае асноўны змест навучання і арыентуе студэнта на актыўныя формы самаадукацыі, практычнае замацаванне навыкаў творчага мыслення і дзейнасці; в) уліку сістэмы маральна-акадэмічных заахвочванняў студэнтаў з боку выкладчыкаў, кафедраў і рэктарата.

Апошняе важна для надання вучэбна-выхаваўчаму працэсу характару спаборніцтва, фарміравання ўстойлівых матывацыйных асобасных установак на свядомае развіццё



БИБЛИОТЕКА БГУКИ

творчых здольнасцей, псіхалагічных "механізмаў" творчай дзейнасці.

Менавіта з гэтых прадпасылак арганізацыі вучэбнай дзейнасці студэнтаў, асабліва ў падрыхтоўцы і правядзенні семінарскіх заняткаў, усёй самастойнай работы студэнтаў і зыходзіць кафедра філасофіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры. Мы лічым самастойную работу студэнта асновай усяго вучэбна-выхаваўчага працэсу, эфектыўным сродкам фарміравання спецыяліста ў ВНУ. Гэта асноўны вучэбны рычаг сучаснай вышэйшай школы, які рэалізуе прынцып яе дзейнасці. І трэба сказаць, што Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры мае ўсё неабходнае для таго, каб кафедры маглі арганізаваць самастойную вучэбную працу студэнтаў на сучасным узроўні: бібліятэка ўкамплектавана дастатковай колькасцю патрэбнай вучэбнай літаратуры; існуюць дасканала распрацаваныя вучэбныя планы, якія прадугледжваюць лагічнае размеркаванне лекцыйных і семінарскіх (практычных) заняткаў; вучэбныя планы ўключаюць шырокі спектр спецыяльных дысцыплін і дысцыплін спецыялізацый, якія арыентуюць на актыўныя формы вучобы, развіваюць творчасць. Натуральна, у гэтых умовах кафедра філасофіі надае першаступеннае значэнне творчай арганізацыі не толькі семінарскіх заняткаў, але і іншых, у тым ліку і пазанавучальных формаў самаадукацыі. Планы семінарскіх заняткаў складзены з улікам профілю універсітэта, каб арыентаваць студэнтаў на самастойны пошук адказаў на праблемныя пытанні. Студэнтам прапануецца спіс літаратуры, змест якой заключае альтэрнатыўныя падыходы да асвятлення пытанняў вучэбнай праграмы, арыентуе на дыскусіі і самастойныя вывады. На семінарскіх занятках практыкуюцца абарона рэфератаў, праблемныя прэс-канферэнцыі студэнтаў па выбраных імі тэмах з адказамі на пытанні калег; адказы студэнтаў на пытанні да семінарскіх заняткаў па прынцыпе "а я



БІБЛІЯТЭКА БГУКІ

думаю інакш" (з выкладаннем уласнага бачання праблем); дыскусіі, метад "мазгавога штурму", калёквіумы па праблемных пытаннях; міні-кантрольныя; конкурснае рашэнне філасофскіх красвордаў і інш. Важнае месца ў самастойнай рабоце належыць штогадовым навуковым студэнцкім канферэнцыям па філасофскіх навуках. У іх кожны раз прымае ўдзел больш за 25% студэнтаў II—III курсаў універсітэта.

Зразумела, што ўзровень творчасці ў сістэме самастойнай работы студэнтаў істотна залежыць ад якасці навукова-метадычнай дакументацыі: планаў семінарскіх заняткаў, вучэбна-метадычных рэкамендацый і інш. Такую дакументацыю кафедра ў бягучым навучальным годзе стварае па ўсіх філасофскіх навуках. Менавіта з арыентацыяй на творчыя формы работы выкладчыкі кафедраў завяршаюць напісанне вучэбнага дапаможніка для самастойнай работы па філасофіі. Гэты дапаможнік прадугледжвае сістэму нестандартных задач, якія накіраваны на пошук і рашэнне студэнтамі складаных праблем філасофскай самаадукацыі.

Мэтам фарміравання спецыяліста, здольнага творча мысліць, адпавядае і вучэбная практыка выкладчыкаў кафедры. Мы асабліва значэнне надаём уключэнню ў вучэбны працэс элементаў спаборніцтва, імкнёмся да таго, каб кожны меў магчымасць дэманстраваць свае веды і навыкі лектарскага майстэрства на семінарскіх занятках. У гэтай рабоце першачарговае значэнне надаём лекцыі, яе зместу, праблеме, сувязі з "чаканнямі" і практычнымі патрабаваннямі студэнта. Лекцыя павінна несці студэнту не толькі новыя веды, фарміраваць яго перакананні і светапогляд, але і ўплываць на матывацыйную сферу асобы, выклікаць у яе жаданні вучыцца творчасці, ствараць сябе як асобу, здольную ўплываць на прагрэс культуры.

У мэтах захавання прозвішчаў лепшых студэнтаў у гісторыі універсітэта кафедра ў бягучым навучальным годзе пачала весці



БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Кнігу гонару "Навечна з універсітэтам". Для атрымання зваротнай сувязі аб выніках вучэбнай дзейнасці пры кафедры створана студэнцкая сацыялагічная лабараторыя.

Ёсць пытанні, якія стрымліваюць развіццё самастойнай работы студэнтаў. Не заўсёды ўстанаўліваюцца аптымальныя суадносіны лекцыйных і семінарскіх заняткаў па філасофскіх дысцыплінах, адсутнічаюць у вучэбных планах гадзіны на індывідуальную работу са студэнтамі па дысцыплінах гуманітарнага цыкла, не прадугледжаны вучэбнымі планамі такія формы актыўнай самастойнай работы студэнтаў, як напісанне заліковых рэфератаў па комплексных тэмах, тэматычныя навукова-тэарэтычныя канферэнцыі ў рамках сеткі семінарскіх заняткаў, не залічваюцца ў вучэбную нагрузку выкладчыкаў індывідуальныя кансультацыі студэнтаў і інш.

Трэба мець на ўвазе, што неабходны эфект у падрыхтоўцы будучых спецыялістаў у творчай дзейнасці ВНУ мы будзем мець толькі ў тым выпадку, калі гэта работа будзе весціся комплексна, па ўсіх цыклах агульнанавуковай і прафесійнай падрыхтоўкі, прадугледжаных вучэбнымі планамі. Найбольш адэкватнай формай комплекснага рашэння праблемы з'явілася б распрацоўка ў БДУ культуры адпаведнай мэтавай комплекснай праграмы арганізацыі самастойнай работы студэнтаў на ўвесь перыяд навучання. У гэтай праграме можна было б прадугледзець вялікі дыдактычны патэнцыял, які закладзены ў міжпрадметных і міжцыклавых сувязях, у комплексным вопыце педагагічнага складу універсітэта. Натуральна, што такая праграма павінна быць адаптавана да тых прафесійных праблем, якія належыць ажыццявіць нашым выпускнікам на шляху прагрэсу сацыякультурнай сферы ў новым стагоддзі.